Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 ЛІПЕНЯ 2008 г. СЕРАДА № 130 (26243)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Новыя назначэнні

Кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь назначаны **Уладзімір МАКЕЙ**, які вызвалены ад пасады памочніка Прэзідэнта.

Дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Беларусі назначаны **Юрый ЖАДОБІН**. Замест яго старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі назначаны генерал-маёр **Вадзім ЗАЙЦАЎ**. Да гэтага часу ён займаў пасаду першага намесніка старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта — начальніка галоўнага аператыўнага ўпраўлення.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:
# «БЕЛАРУСЬ — АПЛОТ МІРУ І БЯСПЕКІ Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ РЭГІЁНЕ»

Беларусь з'яўляецца аплотам міру і бяспекі ў еўрапейскім рэгіёне. За гады незалежнасці мы не ўцягнуліся ні ў адну палітычную авантуру, не ўвязаліся ні ў адзін міжнародны канфлікт. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 15 ліпеня на прыёме выпускнікоў факультэта Генеральнага штаба Ўзброеных Сілаў, камандна-штабнога факультэта Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь і ваенных акадэмій Расійскай Федэрацыі. У мерапрыемстве ўдзельнічалі 149 выпускнікоў.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Ўзброеныя Сілы чарговы раз папоўніліся афіцэрамі, якія атрымалі вышэйшую адукацыю. У іх ліку і першыя выпускнікі факультэта Генеральнага штаба Ўзброеных Сілаў Ваеннай акадэміі Беларусі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі сёння забяспечаны мір, стабільнасць, грамадская згода. «Але, на жаль, сучасны свет не становіцца больш бяспечным, і мы ўсё з'яўляемся сведкамі перыяду абвастрэння геапалітычных, эканамічных, экалагічных і дэмаграфічных праблем. І ўсё гэта так або інакш датычыцца нашай Беларусі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што цяпер рэзка актывізавалася ваенная і тэрарыстычная дзейнасць у многіх рэгіёнах планеты, у тым ліку і ў еўрапейскім. «Пашырэнне НАТА на ўсход, разгортванне ў непасрэднай блізкасці ад нашых граніц элементаў амерыканскай сістэмы стратэгічнай процiракетнай абароны, дзвальвацыя міжнароднай прававой базы ў галіне кантролю над узбраеннямі значна ўскладняюць ваенна-палітычную сітуацыю», — перакананы Прэзідэнт.

Эканамічныя санкцыі супраць Беларусі, палітычныя націск і спекуляцыі па пытаннях свабоды і дэмакратыі супярэчаць працоўнічнасці і добрасуседству, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы сказаў, што «на жаль, з вуснаў некаторых заходніх палітыкаў пастаянна гучаць адкрытыя заклікі да антыканстытуцыйнай змены ўлады ў Беларусі, да насаджэння заходняй мадэлі так званай дэмакратыі».

На думку Прэзідэнта Беларусі, мэта такіх дзеянняў — дэстабілізацыя становішча, знішчэнне палітычнай сістэмы, падпарадкаванне суверэннай дзяржавы тым сілам, якія імкнуцца да ўстанаўлення аднапалярнага свету. «Але толькі мы самі маем права вырашаць, як нам жыць, у якім напрамку развівацца, з кім супрацоўнічаць і сябраваць. У гэтым заключаецца сапраўдная незалежнасць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён сказаў, што зроблены грамадзянамі Беларусі гістарычны выбар накладае на сучаснае пакаленне асаблівую адказнасць за захаванне міру і стабільнасці на беларускай зямлі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь няўхільна выконвае міжнародныя дамоўленасці, не прымаючы сілавыя метады як інструмент знешняй палітыкі, выступае актыўным удзельнікам працэсу ўмацавання міжнароднай бяспекі. На яго думку, гістарычны вопыт беларускага народа і сучасныя рэаліі сусветнай палітыкі патрабуюць пастаяннай увагі да пытанняў нацыянальнай бяспекі.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што падтрыманне абараназдольнасці арміі ў самай высокай ступені заўсёды будзе прыярытэтнай задачай кіраўніцтва краіны. «Незалежную палітыку мы можам праводзіць выключна тады, калі мы моцныя, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Тады мы будзем здольныя даць сваю рашучы адпор любым замахам на нашу краіну, незалежнасць і суверэнітэт».

У Беларусі цяпер, пасля завяршэння рэфармавання арміі, працягваецца яе ўдасканаленне з мэтай пераходу на новы якасны ўзровень. На думку Прэзідэнта, гэта дае магчымасць адпавядаць патрабаванням часу, вывучаць і асвойваць новыя формы і спосабы ўзброенай барацьбы, каб не паўтарыць памылак і трагедый мінулых войнаў.

«Важнейшая задача Ўзброеных Сілаў на бліжэйшую перспектыву — падтрыманне высокай ступені боегатоўнасці і недапушчэнне перарастання ваеннай небяспекі ў ваенную пагрозу», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна развіваць рэгіянальную групоўку войскаў Беларусі і Расіі, якая сёння з'яўляецца гарантам бяспекі заходніх граніц нашых краін.

Забеспячэнне нацыянальнай бяспекі немагчыма без адукаванага, усебакова падрыхтаванага афіцэра-прафесіянала, патрыёта, які прысвяціў жыццё бескарыслівааму служэнню свайму народу і Айчыне. Менавіта таму наша дзяржава робіць усё, каб у навучальных установах афіцэры атрымлівалі сучасную якасную падрыхтоўку, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што грамадства і дзяржава прад'яўляюць высокія патрабаванні да афіцэрскага корпуса.

Па традыцыі выпускнікам, якія закончылі ваенныя навучальныя ўстановы з залатым медалём, Аляксандр Лукашэнка ўручыў спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта 12 выпускнікоў ваенных факультэтаў беларускіх і расійскіх ВНУ.

Кіраўнік дзяржавы таксама ўручыў генеральскія пагоны 4 афіцэрам — прадстаўнікам Міністэрства абароны і Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# РУПЛІВАЯ, ЯК ПЧОЛКА



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

*Гэтак кажуць пра жыхарку вёскі Хвойнік Пружанскага раёна Людмілу ПРОДАН. Шэсць гадоў сталай працы ў якасці пчаляра Белавежскай пушчы былі насычаны для яе не толькі клопатамі пра здабыванне мёду — гэта само сабою. Яе пчальнік — узор гаспадарлівасці, сапраўдны кветкавы куток. Нягледзячы на пару года і надвор'е стан душы тут заўсёды выдатны. Сёлета Людміла Віктараўна размалявала яшчэ парачку пчаліных домікаў, паднавіла ранейшыя малюнкі — гэта яе перакананне, што прыгажосць і гармонія патрэбны нават маленькай працавітай пчолцы. У нацыянальным парку клопаты Людмілы Продан заўсёды знаходзяць падтрымку кіраўніцтва. А першы памочнік пчалярцы ля вулляў, асабліва ў час меданосу, — яе муж Мікалай.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Адтэрміноўка аспірантам-завочнікам

У Беларусі пашыраны пералік грамадзян, якія маюць права на адтэрміноўку ад прызыву для заканчэння адукацыі. Аб гэтым паведаміў намеснік начальніка аддзела прызыву галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Ўзброеных Сілаў Беларусі Сяргей Купрык.

Гэтыя змяненні былі ўнесены ў Закон «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» ад 20 ліпеня 2007 года і сёння ўпершыню рэалізуюцца на практыцы. У гэтым і заключаецца галоўная асаблівасць сёлетняга прызыву, адзначыў намеснік начальніка аддзела. У адпаведнасці з папраўкамі адтэрміноўка ад прызыву ўпершыню будзе прадастаўлена выпускнікам устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, — да 1 верасня года заканчэння ўстановы адукацыі. Такое права атрымаюць грамадзяне, якія навучаюцца ў магістратуры, і аспіранты (дактаранты) — на перыяд навучання незалежна ад формы навучання. Раней адтэрміноўка прадастаўлялася магістрантам і аспірантам (дактарантам) толькі вочнай формы навучання.

**Кар. БЕЛТА.**

Ва Ўрадзе

# ПАДАТКІ ПА-НОВАМУ

## *У 2009 годзе плануецца ўвесці лінейную адзіную стаўку падаходнага падатку ў памеры 12 працэнтаў*

**У наступным годзе прагназуецца забяспечыць рост валавога ўнутранага прадукту, прадукцыі прамысловасці на ўзроўні 110—112 працэнтаў, паведаміў на пасяджэнні Савета Міністраў Беларусі міністр эканомікі Мікалай Зайчанка, прадстаўляючы праект указа аб зацвярджэнні найважнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі на 2009 год. «Параметры эканамічнага развіцця складаныя і напружаныя, яны фактычна адпавядаюць узроўню гэтага года, — заўважыў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. — У першым паўгоддзі 2008 года эканоміка спрацавала ў запланаваных параметрах — тэмп росту ВУП склаў 110,4 працэнта».**

Найважнейшыя параметры, пра якія ішла ўчора гаворка, паводле слоў Мікалая Зайчанкі, сфарміраваныя не толькі зыходзячы з праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі на 2006—2010 гады, але і з улікам той задачы, якую паставіў Прэзідэнт, а менавіта — забяспечыць узровень сярэднямесячнай зарплаты да канца 2010 года не менш як 700 долараў ЗША ў эквіваленце. Што, зразумела, патрабуе і больш высокіх тэмпаў эканамічнага развіцця. Пры распрацоўцы прагнозу, падкрэсліў кіраўнік міністэрства, улічвалася як унутраная сацыяльна-эканамічная сітуацыя, так і ўплыў знешніх фактараў росту, у першую чаргу, рост цэнаў на энерганосьбіты. І, закранаючы пытанне аб магчымай у 2009 годзе інфляцыі, Мікалай Зайчанка звярнуў увагу на тое, што сусветная тэндэнцыя яе росту акажа свой уплыў і на эканоміку нашай рэспублікі, якая з'яўляецца адкрытай і залежыць ад імпарту энерганосьбітаў. «У той жа час для забеспячэння стабільнасці суб'ектаў гаспадарання і ў цэлым эканомікі вельмі важна не перавысіць узровень інфляцыі ў 9—11 працэнтаў, — лічыць ён. — Гэта тая мяжа, якую мы ставім».

Гаворачы пра інвестыцыі ў асноўны капітал, міністр, у прыватнасці, праінфармаваў, што ў наступным годзе прагназуецца забяспечыць іх прырост на 23—25 працэнтаў, інвестыцыйны складнік у ВУП дасягне каля 30 працэнтаў. На вырашэнне гэтых задач за кошт усіх крыніц фінансавання прапануецца накіраваць 47—48 трыльёнаў рублёў. А дасягненне згаданых параметраў будзе ажыццяўляцца праз дзяржаўную інвестыцыйную праграму, а таксама за кошт рэалізацыі канкрэтных інвестыцыйных праектаў, якія прадугледжваюцца пяцігадовымі галіновымі і рэгіянальнымі інвестпраграмамі. У наступным годзе, паведаміў міністр, плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 213 аб'ектаў, у тым ліку 39 першага ўзроўню (новыя прадпрыемствы).

Найважнейшым элементам эканамічнага росту і мадэрнізацыі вытворчага патэнцыялу, на думку міністра, стане павелічэнне аб'ёмаў замежных інвестыцый. Прычым для актывізацыі інвестыцыйнага працэсу ўжо напрацавана значная прававая база. У перспектыве для прыцягнення замежных інвестыцый прадугледжваецца нарматыўна замацаваць існаванне ў Беларусі кіраўніцкіх кампаній і інвестфондаў, стварэнне венчурных фондаў, а таксама больш шырокае выкарыстанне фондавага рынку і яго інвестыцыйных магчымасцяў. «Мы ставім задачу, — сказаў Мікалай Зайчанка, — і будзем яе вырашаць, па ўваходжанні Беларусі ў лік 30 краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для вядзення бізнэсу».

Разам з тым прэм'ер-міністр прапанаваў увесці ў 2009 годзе два новыя паказчыкі якаснага развіцця эканомікі па аб'ёме інвестыцый на аднаго занятага ў эканоміцы і па аб'ёме інавацыйнай і высокатэхналагічнай прадукцыі ў агульным аб'ёме экспарту. Паводле яго меркавання, іх увядзенне будзе стымуляваць вытворцаў працаваць эфектыўна, абнаўляць фонды, ствараць новыя вытворчасці. «У нас няма ўласных прыродных рэсурсаў, таму мы павінны развіваць экспарт высокатэхналагічнай прадукцыі», — заўважыў прэм'ер.

Дарэчы, адносна экспарту прагноз Мікалая Зайчанкі наступны: у 2009 годзе экспарт тавараў і паслуг перавысіць тэмп росту ВУП на 6,5—7 працэнтных пунктаў. Тым больш, мяркуе міністр, што для айчынных экспарцёраў у 2009 годзе будзе захоўвацца спрыяльная кан'юнктура. Адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі прагназуецца ў аб'ёме 1,47—1,5 мільярда долараў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ТРАГЕДЫЯ ПАД МАГДЭБУРГАМ

**У пачатку тыдня позна ноччу на федэральнай трасе № 2 Берлін—Гановер у Германіі мікрааўтобус з беларускімі нумарамі на вялікай хуткасці ўрэзаўся ў грузавы аўтамабіль.**

Удар быў такім страшэнным, што грузавік нават скінула ў прыдарожны кювет. Пяць нашых землякоў загінулі, а трое пасажыраў у цяжкім стане знаходзяцца ў бальніцах Магдэбурга. Па папярэдніх даных, яны — група жыхароў Гродзенскай і адзін Мінскай вобласці, накіроўваліся за аўтамашынамі. Звычайная летняя паездка. І раптам такое...

У мяне, напрыклад, пытанне выклікае той факт, што грузавік ноччу чамусьці стаяў на дарозе. Такія паводзіны яго вадзіцеля, хутчэй, выключэнне, чым правіла. Па нямецкіх якасных і адносна бяспечных аўтабанах легкавушкі, хутчэй, лятаюць, чым ездзяць. Наколькі мне вядома, стаянкі грузавікоў на абочыне аўтабанаў у ФРГ калі не забароненыя, то ва ўсякім разе не вітаюцца ўладамі. Для дзённага і тым больш начнога адпачынку вадзіцеляў, у тым ліку вялікагрузных машын, уздоўж асноўных дарог Германіі абсталяваныя вялікія пляцоўкі для стаянак з кафэ, крамамі, тэлефонамі, туалетамі, столікамі з лаўкамі, асвятленнем і г.д. Звычайна там дальнабойшчыкі і начуюць.

Пакуль існуюць толькі версіі прычын гэтай жудаснай дарожна-транспартнай катастрофы. Відаць, асноўная і больш адпаведная сітуацыя: вадзіцель мікрааўтобуса заснуў за рулём. Але канчаткова прычына аварыі будзе названа пасля заканчэння следства, якое цяпер праводзяць супрацоўнікі магдэбургскай пракуратуры. Як паведамілі ў прэс-службе МЗС, беларускія дыпламаты нашага пасольства знаходзяцца ў пастаянным кантакце з прадстаўнікамі нямецкіх праваахоўных органаў, а таксама медыкамі клінік, куды змешчаны параненыя. Консульская служба пасольства занята арганізацыяй дастаўкі целаў загінулых на радзіму. Будзем спадзявацца, што на ўсе нашы пытанні мы хутка атрымаем адказы з Германіі.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

### ГОМЕЛЬСКІХ МЫТНІКАЎ ІНТУІЦЫЯ НЕ ПАДВОДЗІЦЬ

**Так было і на гэты раз, калі супрацоўнікі аддзела Церуха мытнага паста «Гомель-пасажырскі» вырашылі праверыць міжстолевую прастору аднаго з вагонаў цягніка, які браў курс з Адэсы на Мінск. Памылкі не было: там знаходзілася кантрабанда — 21 манета розных краін і 136 нагрудных знакаў агульным коштам звыш дзесяці мільёнаў рублёў. Ніхто з апытаных пасажыраў не прызнаўся, каму належала гэта калекцыя, якая зойме сваё месца ў музеі гісторыі Гомельскай мытні.**

А наогул, як паведаміла нам прэс-група гэтай арганізацыі, сёлета за паўгоддзе гомельскія мытнікі выявілі 589 выпадкаў незаконнага вывазу і ўвозу тавараў на амаль тры з паловай мільярды рублёў. Кантрабандысты спрабавалі выгадна прадаць у Расіі каляровы метал на суму ў 12 мільёнаў рублёў, завезці ў Беларусь сотні мабільных тэлефонаў без адпаведных дакументаў і г.д., але гэта ім не ўдалося. Як не ўдалося атруціць здароўе беларусам 351 літрам алкагольных напояў і чатырма тысячамі пачкаў цыгарэт, якія былі затрыманы на мытні.

І яшчэ адна лічба. Канфіскаваны тавар быў рэалізаваны, і ў выніку бюджэт папоўніўся 1302 мільёнамі рублёў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### «ЗАРПЛАТА» — 20 МІЛЬЁНАЎ ЗА МЕСЯЦ

**Упраўленнем дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць у дачыненні да жыхаркі абласнога цэнтра, якая займалася валютнымі аперацыямі.**

Меней чым за месяц (з канца мая па канец чэрвеня), як устанавілі супрацоўнікі ўпраўлення, жанчына, дзякуючы куплі-продажу валюты, атрымала даход у суме каля 20 мільёнаў рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### У БЫЛОЙ ЖОНКІ ЎКРАЎ АБРАЗ

**Абраз, а таксама залатыя і сярэбраныя ўпрыгажэнні знаходзіліся ў кабінеце старшыні аднаго з сельсаветаў Светлагорскага раёна. Былі і раптам зніклі.**

Усхваляваная такім нечаканым паваротам справы, жанчына звярнулася ў міліцыю, якая па гарачых слядах устанавіла асобу злодзея. Ім аказаўся былы муж старшыні мясцовага органа ўлады, які падабраў ключ да дзвярэй яе кабінета, напэўна, вырашыўшы, што ўказаныя рэчы якраз дапоўняць тыя, якія дасталіся яму пры ранейшым раздзеле маёмасці.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### «НАВАРЫЎ» НА КАТЛАХ

**Праваахоўнікамі арыштаваны 43-гадовы грамадзянін Латвійскай Рэспублікі, які падазраецца ў махлярстве.**

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, як мяркуецца, прайдзісвет завалодаў 451 мільёнам 414 тысячамі рублёў двух магілёўскіх прадпрыемстваў. Следчыя ўстанавілі, што махляр правярнуў немудрагелістую аферу: ён 21 лістапада і 4 снежня мінулага года паставіў гэтым прадпрыемствам пад выглядам дарагіх ацяпляльных катлоў больш танныя.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# НЕ ЦЫГАРЭТА, А... ЭСТАФЕТА



*На конкурсе «Кулінарны паядынак».*

**Майка і шорты замест дзелавога касцюма, палатка замест строгага офіса. У Рэспубліканскім гарналыжным цэнтры «Сілічы» прайшоў вось ужо дзесяты юбілейны летні турыстычны злёт работнікаў цэнтральнага апарату і сталічных філіялаў ААТ «ААБ Беларусбанк», прысвечаны Году здароўя. Удзел у спаборніцтвах узялі больш за 500 чалавек, прычым каб патрапіць у каманды на злёт, літаральна кожнаму давялося вытрымаць нежартоўную канкурэнцыю з боку... сваіх жа калег.**

Работа з грашыма — гэта ў любым выпадку павышаная ўвага, адказнасць, дысцыпліна, маральныя і фізічныя выдаткі, пастаянная рызыка стрэсу. Напэўна, таму ідэя арганізацыі турыстычных злётаў спадабалася адразу. І да таго ж па некалькі прычынах. З аднаго боку, злёты давалі шанц правесці колькі дзён на прыродзе, магчымасць прадэманстраваць сваю спартыўную падрыхтоўку. А з іншага стала зразумела: толькі так калектыў самага буйнага банка краіны можа стаць адной камандай. Нездарма знаёмствы прадстаўнікоў розных філіялаў, нефармальныя сустрэчы і, вядома ж, самі спаборніцтвы прыносяць нават крыху нечаканы, але прыемны вынік: штогод пасля турзлётаў утвараецца некалькі «банкаўскіх» сем'яў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ГРАН-ПРЫ ЕДЗЕ Ў ЛІТВУ

**Гран-пры, 10 тысяч долараў і спецыяльны прыз «Ліра», як і чакалася, у прадстаўніка Літвы Данатаса МОНТВІДАСА. Першая прэмія падзеленая па 3 тысячы на дваіх — Віталя Гардзея і Алену Валеўскую. Другая прэмія і 4 тысячы у Надзіко з Грузіі. Нарэшце, на трэцім месцы, атрымаўшы па 1 тысячы долараў кожны, балгарын Пламен Патаў і ўкраінец Уладзіслаў.**

## Віталь Гардзей: «Мне не было сорамна за бескарысна пражытыя гады»

*Дождж, які нагнятаў абстаноўку ў першы дзень конкурсу маладых выканаўцаў, як быццам узяў тайм-аўт. І ўдзельнікі, скарыстаўшы момант, далі дыхту. А можа, проста пад фанаграму, няхай сабе і «мінус 1», выступаць прасцей, чым з вялікім аркестрам? Не, хутчэй, справа ў тым, што эстрадная песня кампазітара краіны і на мове краіны, якую прадстаўляе кожны ўдзельнік, бліжэй да розуму і сэрца. Найперш уласна выканаўцы.*

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*



Віталь ГАРДЗЕЙ.



Алена ВАЛЕЎСКАЯ.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КУРС ЕЎРА ЎСТАНАВІЎ НОВЫ РЭКОРД



**Курс еўра падчас таргоў на Лонданскай біржы падняўся да гістарычнага максімуму ў 1,6038 долара.**

Долар падае да еўра, іены і фунту стэрлінгаў на працягу некалькіх апошніх дзён. Паслабленне амерыканскай валюты звязана з заклапочанасцю інвестараў з нагоды стану эканомікі ЗША. Спецыялісты прагназуюць, што яшчэ да канца лета суадносіны еўра-долар могуць пабіць узровень 1,70.

### ЛІТВА АДМОВІЦЦА АД УСЕАГУЛЬНАГА ПРЫЗЫВУ І СКАРОЦІЦЬ АРМІЮ

**Сейм Літвы ў аўторак, 15 ліпеня, прыняў шэраг законаў аб структуры арміі. У прыватнасці, прадугледжваецца адмова ад усеагульнай воінскай павіннасці і пераход на прафесійны прынцып камплектавання войска да 2014 года.**

Акрамя таго, у законах абумоўліваецца паступовае скарачэнне колькасці літоўскай арміі. Сёння асабовы склад салдатаў тэрміновай і прафесійнай воінскай службы, нацыянальнай гвардыі і курсантаў складае каля 16 тысяч чалавек. Аднак да 2013 года колькасць вайскоўцаў скароціцца да 13,7 тысячы чалавек.

### СААКАШВІЛІ ВІНАВАЦІЦЬ РАСІЮ Ў РАСПАЛЬВАННІ ВАЙНЫ І ПАТРАБУЕ АД ЗАХАДУ ЦВЁРДАЙ РЭАКЦЫІ

**Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі абвінаваціў Расію ў наўмысных правакацыях у сепаратысцкіх рэгіёнах Грузіі — Абхазіі і Паўднёвай Асеціі і заклікаў Захад больш настойліва рэагаваць на тое, што адбываецца, каб прадухіліць узнікненне яшчэ аднаго канфлікту на Каўказе.**

«Я чую, што абодвум бакам варта праяўляць стрыманасць. Мне гэта не здаецца правільным», — заявіў кіраўнік Грузіі газеце The Times. Захад салідарны з Тбілісі, але лічыць, што для «цвёрдых пазіцый момант няўдалы». Тым часам, прама пад Тбілісі распачаліся грузіна-амерыканскія ваенныя вучэнні пад красамоўнай назвай «Неадкладны адказ-2008». Манеўры працягнуцца з 15 да 30 ліпеня пры ўдзеле 1200 вайскоўцаў ЗША і каля 800 грузінскіх вайскоўцаў, а таксама салдатаў і афіцэраў з Азербайджана, Арменіі і Украіны.



Адначасова з грузінскімі манеўрамі сілавыя структуры Расіі ў Паўночнакаўказскай ваеннай акрузе пачалі шырокамаштабныя антытэрарыстычныя вучэнні «Каўказ-2008».

### ДЗВЕСЦЕ ТЫСЯЧ ЯПОНСКІХ СУДНАЎ НЕ ВЫЙШЛІ Ў МОРА З-ЗА СТРАЙКА

**Японскія рыбакі абвясцілі забастоўку ў знак пратэсту супраць росту цэнаў на паліва.**



Каля 200 тысяч рыбалоўных суднаў Японіі — практычна ўся галіна — адмянілі выхад у мора на адзін дзень. Раней супраць падаражання паліва свой пратэст выказалі рыбакі ў Францыі, Грэцыі, Італіі, Іспаніі і Партугаліі.

## КУРСЫ ВАЛЮТ

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.07.2008 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 120,00 |
| 1 еўра | 3 394,65 |
| 1 латвійскі лат | 4 833,01 |
| 1 літоўскі літ | 983,12 |
| 1 чэшская крона | 145,41 |
| 1 польскі злоты | 1040,82 |
| 1 расійскі рубель | 91,67 |
| 1 украінская грыўня | 456,40 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 23,1255 |
| 10 UAH | 50,2041 |
| 1000 BYR | 10,9083 |
| EUR | 36,8759 |

**Курс у гандлёвых кампаніях (на 15.07.2008 г.)**

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

9771990763008 08130>

# ПАДАТКІ ПА-НОВАМУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Грашова-крэдытная палітыка ў наступным годзе, аб чым распавёў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч, перш за ўсё будзе накіраваная на забеспячэнне стабільных тэмпаў росту эканомікі. Павелічэнне долі еўра і расійскага рубля ў структуры знешнеэканамічных разлікаў павышае і значнасць абменнага курса беларускага рубля ў адносінах гэтых валют для эканомікі. Таму ў 2009 годзе прадугледжваецца прывязка курса беларускага рубля да сістэмы замежных валют (долара ЗША, еўра, расійскага рубля), што павысіць і гібкасць нацыянальнай валюты да долара. Пры гэтым хістанне беларускага рубля да долара ацэньваецца ў межах плюс/мінус 5 працэнтаў (2000—2200 рублёў за долар). Каб забяспечыць стабільнасць курса, падкрэсліў Пётр Пракаповіч, неабходна нарасціць золатавалютныя рэзервы на суму не менш як 2 мільярды 250 мільёнаў долараў. У 2010 годзе золатавалютныя рэзервы Беларусі павінны быць не менш за 10 мільярдаў долараў. Стаўка рэфінансавання прагназуецца ў наступным годзе на ўзроўні 10—12 працэнтаў.

Як паведаміў першы намеснік міністра фінансаў Андрэй Харкавец, дэфіцыт кансалідаванага бюджэту Беларусі ў 2009 годзе запланаваны на ўзроўні 2,8 трыльёна рублёў, ці 1,8 працэнта да ВУП. Даходы бюджэту чакаюцца на ўзроўні 71,9 трлн рублёў, расходы — 74,7 трлн. Андрэй Харкавец, які прадстаўляў праект бюджэту, агучыў і новаўвядзенне, якое датычыцца кожнага. Размова ідзе аб прапанове ўвесці з наступнага года адзіную лінейную стаўку падаходнага падатку ў памеры 12 працэнтаў. Ён падкрэсліў, што гэтая стаўка будзе прымяняцца ў дачыненні да даходаў грамадзян як атрыманых па асноўным месцы працы, так і не асноўным. Каб людзі, якія маюць нізкія даходы, не пацярпелі ад новаўвядзення, у праекце прапануецца павялічыць для гэтай катэгорыі стандартны падатковы вылік з 1 базавай велічыні (35 тысяч рублёў) да 200 тысяч. Патэнцыйныя страты бюджэту ад гэтага кроку складуць каля 260 млрд рублёў, аднак, лічаць у міністэрстве, яны будуць кампенсаваныя за кошт росту зарплаты і легалізацыі даходаў.

Акрамя таго, Андрэй Харкавец паведаміў, што ў наступным годзе плануецца знізіць падатковую нагрузку на 1,3 працэнта да ВУП, што складзе каля 2 трыльёнаў рублёў. У прыватнасці, прапануецца зменшыць стаўку збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі сельгасвытворцаў з 2 да 1 працэнта. Гэта дазволіць павысіць канкурэнтаздольнасць беларускіх тавараў на знешніх рынках і павялічыць аб'ём экспарту. У выніку каля 1,4 трыльёна рублёў застанецца ў суб'ектаў гаспадарання. Акрамя таго, з аб'екта падаткаабкладання на нерухомасць плануецца выключыць частку асноўных вытворчых фондаў — станкі, абсталяванне — распаўсюдзіць толькі на аб'екты нерухомай маёмасці. Таксама прапануецца ўстанавіць адзіныя стаўкі па мясцовым падатку з продажу тавараў у рознічным гандлі і падаткі на паслугі ў памеры 5 працэнтаў ад выручкі. А зніжэнне стаўкі абавязковых страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва з 35 да 34 працэнтаў стане дадатковым стымулам для павышэння ўзроўню аплаты працы.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# ЯК ВЫЗНАЧЫЦЬ ГАТОЎНАСЦЬ ДЗІЦЯЦІ ДА ШКОЛЫ?

**Пыталіся? Адказваем...**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Адкажыце, калі ласка, калі бацькі не хочуць аддаваць сваё шасцігадовае дзіця ў школу ў сувязі з тым, што малы яшчэ псіхалагічна не падрыхтаваны да вучобы, ці можна адкласці сустрэчу са школай на адзін год? Ці ўсё ж такі лепш пачынаць вучобу ў шасцігадовым узросце?**

**А.Я. Якубоўская,** *г. Баранавічы.*

**Ці маюць бацькі права выбару навучальнай установы? У школах у раёне новабудоўляў педагагічныя калектывы — зусім маладыя, таму вельмі цяжка меркаваць аб якасці падрыхтоўкі. Да таго ж з прыцэлам на будучыню хацелася б аддаць дзіця ў пачатковую школу пры гімназіі, бо так будзе прасцей падрыхтавацца да паступлення ў гімназію. Ці могуць адмовіць бацькам вучня з іншага раёна?**

**Т.А. Кеўра,** *г. Мінск.*

Як патлумачылі нам у галоўным адукацыйным ведамстве краіны, згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», прыём дзяцей у першы клас ажыццяўляецца з шасці гадоў ці больш позняга ўзросту. Гэта значыць, што ў бацькоў ёсць права самастойна вырашаць, калі аддаваць дзіця ў школу: у 6 ці 7 гадоў. Але як вызначыць гатоўнасць да школы?

Найбольш распаўсюджаная памылка і педагогаў, і бацькоў меркаваць аб гатоўнасці да школы толькі па ўзроўні інтэлектуальнага развіцця. Многія бацькі імкнуцца навучыць сваё дзіця чытаць, пісаць, музыцыраваць, «азам» замежных моў яшчэ да паступлення ў школу. Гэта самы надзейны спосаб давесці малога да эмацыянальнага і нервовага зрыву. Да таго ж уменне чытаць і пісаць зусім не азначае гатоўнасць да школы. Для першакласніка куды больш важна ўмець канцэнтраваць увагу, устанаўліваць сувязі паміж з'явамі і падзеямі, абагульняць, параўноўваць і лагічна разважаць.

Стан здароўя першакласніка — адзін з галоўных фактараў, які ўплывае не толькі на працягласць і паспяховасць працэсу адаптацыі да школы, але і на ўвесь працэс далейшага навучання. Прасцей спраўляюцца са школьнымі нагрузкамі здаровыя дзеці, і цяжэй — дзеці з хранічнымі захворваннямі, якія маюць 3—4-ю групу здароўя, часта і працягла хварэюць. Такім дзецям патрабуецца спецыяльная падрыхтоўка да школы, прычым пачынаць яе трэба яшчэ ў пяцігадовым узросце. За год да паступлення ў школу бацькі павінны правесці паглыбленае абследаванне свайго дзіцяці ў дзіцячай паліклініцы, якое абавязкова ўключае кансультацыю псіханеўролага. Менавіта гэты спецыяліст лепш за іншых можа вызначыць псіхалагічную гатоўнасць дзіцяці да школы. Па выніках абследавання ўчастковы педыятр сумесна з «вузкімі» спецыялістамі распрацуе індывідуальную праграму падрыхтоўкі дзіцяці да школы, выкананне якой будзе спрыяць паляпшэнню яго здароўя і тым самым палегчыць адаптацыю да школы.

Ёсць таксама яшчэ і сацыяльная гатоўнасць дзіцяці да навучання — пад ёй трэба разумець патрэбу дзіцяці ў зносінах з іншымі, настрой дзіцяці на працу і супрацоўніцтва і пэўную самастойнасць. Псіхолагі лічаць, што шасцігодкі належаць усё ж такі больш дашкольнаму свету, чым школе: сапраўды, яны здольныя засвойваць вучэбны матэрыял, але толькі ў выглядзе гульні. Для забеспячэння плаўнага пераходу дзіцяці з дашкольнай установы ў школу і спрашчэння адаптацыі ў верасні прадугледжаны інтэграваны курс «Увядзенне ў школьнае жыццё». На працягу месяца ў першакласнікаў не праводзяцца ўрокі матэматыкі, чытання і пісьма. Настаўнік арганізуе для дзяцей экскурсіі, фізкультурныя заняткі, развіццёвыя гульні, вучыць дзяцей, як ім паводзіць сябе ў калектыве, вывучае гатоўнасць кожнага да школьнага навучання, аказвае дапамогу ў засваенні правілаў і формаў паводзінаў на ўроку, ва ўменні разумець змест пытанняў, якія задае настаўнік. І толькі з кастрычніка пачынаюцца ўрокі па прадметах вучэбнага плана. Для шасцігадовых дзяцей прадугледжана ашчадная арганізацыя адукацыйнага працэсу. Працягласць урокаў складае 35 хвілін з абавязковым правядзеннем дзвюх фізкультурных паўз па 1,5—2 хвіліны кожная, хатнія заданні навучэнцам не задаюцца (акрамя чытання). У сярэдзіне трэцяй, самай працяглай чвэрці, першакласнікам прадастаўляюцца дадатковыя канікулы працягласцю адзін тыдзень. Калі першыя класы размяшчаюцца на базе дашкольных устаноў, то адукацыйны працэс у першую палову дня ажыццяўляе школьны настаўнік, а ў астатні час з навучэнцамі працуюць педагагічныя работнікі дзіцячага садка. А калі першыя класы размяшчаюцца на базе школы, то і там для першаклашак ствараюцца ўсе ўмовы для адпачынку, уключаючы сон, харчаванне, прагулкі і г.д.

Зразумела, што кожнае дзіця трэба рыхтаваць да школы, асабліва тых, хто па нейкай прычыне не наведваў дзіцячы садок. Перш за ўсё трэба развіваць дробную маторыку рук, без якой будзе цяжка засвоіць пісьмо, для гэтага трэба, каб дзіця больш займалася маляваннем ці размалёўваннем, але рабіла гэта старанна і акуратна. Вельмі карысна ляпіць, выразаць, рабіць аплікацыі, складваць канструктары і пазлы. Для таго, каб малы прасцей прызвычаіўся да новых умоў жыцця і вучоба не здавалася яму цяжкім абавязкам, неабходна прывучыць яго выконваць распарадак дня. Гэта будзе спрыяць развіццю арганізаванасці.

Вялікае значэнне мае і псіхалагічная падрыхтоўка. Калі дзіця пачне рыхтавацца да школы загадзя і ўся сям'я будзе браць у гэтым удзел, то будучы першакласнік увойдзе ў школьнае жыццё спакойна і ўпэўнена, а вучоба стане для яго крыніцай радасці. Тут можа паспрыяць гульня дома «ў школу», падтрымка бацькамі аўтарытэту школы і школьных заняткаў. У больш выгадным становішчы, безумоўна, аказваюцца малодшыя дзеці ў сям'і, якія, назіраючы за вучобай дарослых, таксама імкнуцца да школьнага жыцця. Педагогі раяць бацькам паказаць дзіцяці будучае месца вучобы яшчэ, так бы мовіць, у ціхім стане, каб шум натоўпу не напужаў дзіця ў першы дзень верасня.

Дапамагчы ацаніць ступень гатоўнасці дзіцяці да школы бацькам могуць псіхолагі і лагапеды, якія працуюць у дзіцячых садках. Звярніце ўвагу на працаздольнасць дзіцяці, ці можа малы быць уважлівым дастаткова працяглы час, як хутка стамляецца, наколькі добра засвойвае і запамінае новую інфармацыю. Часта здараецца, што пры добра развітым інтэлекце ў дашкольнікаў церпяць менавіта гэтыя бакі псіхікі. У тым выпадку, калі вы ўсведамляеце, што дзіця яшчэ да сустрэчы са школай не падрыхтаванае, то лепш лішні год адвесці на яго аздараўленне і псіхалагічную карэкцыю. Гэта дазволіць малому пазбегнуць у будучыні многіх школьных праблем, звязаных з фізічным і псіхічным здароўем. А калі ёсць становучае заключэнне выхавальнікаў дзіцячага садзіка, урача і псіхолага аб падрыхтаванасці да школы, то лепш адпраўляць дзіця навучацца з шасці гадоў — усё ж такі наперадзе яго чакае адзінаццацігодка...

Прыём дзяцей у агульнаадукацыйныя ўстановы ажыццяўляецца без уступных іспытаў на падставе заявы іх законных прадстаўнікоў і медыцынскага заключэння. Выключэнне складаюць толькі класы з вывучэннем спецыяльных вучэбных прадметаў мастацка-эстэтычнага і спартыўнага накірункаў — там дзеці залічваюцца на падставе вынікаў праверкі іх творчых і фізічных здольнасцяў.

Згодна з Законам «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», бацькі маюць права выбраць для вучобы дзіцяці любую навучальную ўстанову. Аднак на практыцы вельмі часта ўзнікаюць пэўныя цяжкасці з ажыццяўленнем жадання навучацца ў той ці іншай навучальнай установе: калі класы ў ёй перапоўненыя, то дырэктар мае ўсе падставы адмовіць бацькам вучня з іншага раёна. Максімальная напаўняльнасць класаў складае 20 чалавек. Да таго ж у школу ў першую чаргу залічваюцца дзеці, якія пражываюць побач з ёй. За кожнай установай адукацыі замацаваныя пэўныя мікрараёны. Але калі свабодныя месцы ёсць, кіраўніцтва абавязана ўзяць у школу ўсіх ахвотнікаў.

У Міністэрстве адукацыі сцвярджаюць, што змест вучэбных праграм — аднолькавы для ўсіх пачатковых класаў, незалежна ад таго, пры гімназіі яны працуюць ці ў звычайнай школе. Таму больш разумна бацькам шукаць школу бліжэй да дому, каб пазбегнуць лішніх нагрузак і стрэсаў, звязаных са штодзённымі паездкамі дзіцяці ў грамадскім транспарце. Да таго ж трэба шукаць не толькі школу, але першага настаўніка, ад асобы якога ў немалой ступені будзе залежаць раскрыццё здольнасцяў і самарэалізацыя дзіцяці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Спорт-тайм

### МІРНЫ І КАМПАНІЯ ЎПЕРШЫНЮ ЗГУЛЯЮЦЬ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Учора беларускія тэнісісты далі сваю першую прэс-канферэнцыю напярэдадні матча Кубка Дэвіса ў першай Еўра-Афрыканскай групе. Асаблівасцю матча стане тое, што сустрэчы ў Мінску (18—20 ліпеня) упершыню пройдуць не ў сталічным футбольным манежы, а на адкрытым корце Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі. Паводле слоў капітана нашай каманды Дзмітрыя Татура, беларусы настроены па-баявому і не збіраюцца расслабляцца з-за таго, што ў складзе сапернікаў (гэта зборная Польшчы) адсутнічаюць вядучыя тэнісісты Давід Алейнічак і Лукаш Кубот. Ён таксама заўважыў, што нашы разлічваюць узяць рэванш за паражэнне палякам у 1996 годзе. Нагадаем, што ў «абойме» Дзмітрыя Татура вопытныя тэнісісты Максім Мірны і Уладзімір Валчкоў, а таксама маладыя ігракі Андрэй Каратчэня і Павел Катляроў. Уладзімір Ігнацік не зможа дапамагчы беларусам на корце, бо выступае на турнірах у ЗША.

### ХАЦКЕВІЧ І ТУМІЛОВІЧ ЗГУЛЯЮЦЬ СУПРАЦЬ «БАЕРА»

19 ліпеня на мінскім стадыёне «Дынама» адбудуцца провады беларускіх футбалістаў Аляксандра Хацкевіча і Генадзя Туміловіча, якія афіцыйна аб'явяць аб завяршэнні гульнявой кар'еры. У рамках мерапрыемства пройдзе таварыскі матч «Дынама» (Мінск) — «Баер» (Леверкузен), уваход на які будзе бясплатны. Трансляцыя — на тэлеканале «ЛАД» у 18.55. Гульня таксама будзе дэманстравацца на вялікім экране ля Палаца спорту. Перад пачаткам балельшчыкі змогуць паглядзець 13-хвілінны фільм аб спартыўнай кар'еры ігракоў.

### АКШАЕЎ ПАКІДАЕ «НЁМАН»

Пасля матча 15-га тура «Нёман» — «Граніт» (19 ліпеня) пасаду галоўнага настаўніка гродзенскай каманды пакіне Вячаслаў Акшаеў. Прычынай гэтага названы сямейныя абставіны. З другога круга чэмпіяната Беларусі ў вышэйшай лізе трэнер узначаліць мінскі «Лакаматыў».

# Памяць павінна жыць! Але не толькі на словах...

**Па пісьму чытача**

*«Ёсць у Мінску ля Чэрвеньскага рынку адзін памятны знак у гонар загінулых падпольшчыкаў П.С. Алейчыка, М.Ф. Герасімовіча і Г.А. Манцыводы. Любы памятны знак, згадзіцеся, патрабуе хоць нейкага догляду. А тут — вакол ляжыць смецце з недакуркаў цыгарэт, коркаў ад віна-гарэлачных вырабаў, ды і сам памятны знак парос «травой забыцця» (падмурак пачаў трэскацца). Я спадзяваўся, што хоць да Дня Незалежнасці Беларусі тут навядуць парадак. Прыходзіў штодзень. Спадзяваўся. Але, на жаль, ніхто не аддаў даніну павагі загінулым... Вельмі хочацца, каб людзі паважалі тыя помнікі і памятныя знакі, якія маюцца ў нашай краіне. Вядома, тыя пакутнікі, якія загінулі ў час вайны, не былі святымі, як і кожны з нас, але ж яны загінулі ў змаганні за незалежнасць нашай краіны, каб нам сёння добра і свабодна жылося».*

**Уладзімір Міхайлавіч Голубеў, чытач «Звязды» з 1957 года.**

Вось што наконт гэтага сказалі мне ў аддзеле культуры адміністрацыі Ленінскага раёна горада Мінска:

— Цяпер на тэрыторыі сквера па вуліцы Аранжарэйнай выконваюцца работы УП «Цепласеткабуд» па капітальным рамонце цеплатрасы (гэтыя абставіны перашкаджаюць падтрымліваць у належным санітарным стане тэрыторыю вакол памятнага знака). Але, нягледзячы на гэта, супрацоўнікамі ВКУП «Зелянбуд Ленінскага раёна горада Мінска» скошана трава і прыбрана смецце.

Акрамя таго, па просьбе намесніка дырэктара па бягучым утрыманні ВКУП «Зелянбуд Ленінскага раёна» Таццяны Петрачэнкі мы накіравалі ліст у раённае ўпраўленне ўнутраных спраў з просьбай звярнуць увагу супрацоўнікаў міліцыі на дадзены аб'ект у час патрульных рэйдаў. Памятны знак уключаны ў маршрут добраахвотных дружын маладзёжнага атрада аховы правапарадку Ленінскага РК ГА БРСМ.

Я паехала шукаць памятны знак, каб асабіста пераканацца ў словах неабыякавага чытача. Фота таго, што там пабачылі, вырашана не друкаваць.



Перад тым як патэлефанаваць Таццяне Петрачэнцы, я наведала памятны знак яшчэ раз. Тое, што ўбачыла, не магло не парадаваць: вялікага смецця (папер і бутэлек не было). Але недакуркі і коркі ад бутэлек, якіх з часам становіцца ўсё больш і больш, і якія, каб дастаць з зямлі, трэба падкалупнуць, так і працягвалі «аздабляць» памятны знак...

Паводле слоў Таццяны Сцяпанаўны, работніцы толькі і паспяваюць прыбіраць смецце штораніцы. Бо памятны знак стаў прыстанішчам людзей без пастаяннага месца жыхарства. Яны сядзяць там на газетах ці кардонных пачках і распіваюць таннае віно. Таму хацелася б, каб на тэрыторыю, дзе стаіць памятны знак, супрацоўнікі міліцыі звярнулі большую ўвагу.

— А што вы можаце сказаць наконт патрэсканага пастамента?

— Гэты памятны знак знаходзіцца на балансе Міністэрства культуры, таму патрэсканы ад старасці фундамент можа быць папраўлены толькі пасля іх распараджэння.

Паважаны Ўладзімір Міхайлавіч, пераканана, абавязкова праверыць сітуацыю з далейшым лёсам помніка.

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

## Акно ДАІ

# ПЕШАХОД: СЯБАР ЦІ ВОРАГ?

Гэтымі днямі сталічная Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць спецыяльныя комплексныя мерапрыемствы пад умоўнай назвай «Пешаходны пераход». Іх мэта — прадухіленне гібелі пешаходаў у дарожна-транспартных здарэннях на пешаходных пераходах, актывізацыя работы супрацоўнікаў ДАІ па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху. Штодзень супрацоўнікі раённых аддзелаў ДАІ г. Мінска будуць несці службу ў зонах нерэгулюемых пешаходных пераходаў у ранішні і вячэрні час, праводзіць прафілактычную работу не толькі з пешаходамі, але і з вадзіцелямі транспартных сродкаў. Для выяўлення парушэнняў правілаў праезду пешаходных пераходаў плануецца прымяненне прыбораў фота- і відэафіксацыі.

Адна з прычын правядзення ўказаных мерапрыемстваў — павелічэнне колькасці парушэнняў праезду пешаходных пераходаў і як вынік — учыненне дарожна-транспартнага здарэння. Часам чалавек, які сядзіць за рулём аўтамабіля, зняважліва ставіцца да іншых удзельнікаў дарожнага руху і самым нахабным чынам парушае правілы праезду пешаходных пераходаў. Адсюль і няўмольная статыстыка. Так, за 6 месяцаў 2008 года па г. Мінску зафіксаваны 134 выпадкі парушэння праезду пешаходнага пераходу, для параўнання: у 2007 годзе іх было толькі 123. Гэты від парушэння знаходзіцца на першым месцы сярод прычын ДТЗ. Другое ж «ганаровае» месца займае пераход праезнай часткі ў неўстаноўленым месцы. І толькі такія парушэнні, як перавышэнне хуткасных рэжымаў, правілаў манеўравання, нецвярозы стан вадзіцеляў, парушэнне правілаў праезду скрыжаванняў і да т.п. замыкаюць гэты спіс. Як гаворыцца, факт застаецца фактам.

Ці можа пешаход з бяспекай для сябе і свайго здароўя перайсці праз вуліцу, дзе імчацца аўтамабілі? Паважаныя вадзіцелі, задумайцеся. Магчыма, калі-небудзь і вы будзеце на яго месцы. Таму, убачыўшы чалавека, які набліжаецца да пешаходнага пераходу, або нават пешаходны пераход без людзей, загадзя збаўце хуткасць і будзьце гатовыя да тармажэння. Калі пешаход перабягае дарогу, трэба не аб'язджаць яго, а тармазіць, таму што чалавек можа спыніцца, пабегчы наперад ці назад. Згодна з патрабаваннямі пункта 117 Правілаў дарожнага руху, «калі перад пешаходным пераходам спыніўся ці запаволіў рух транспартны сродак, то вадзіцелі іншых транспартных сродкаў, што рухаюцца па суседніх палосах руху ў спадарожным накірунку, павінны знізіць хуткасць руху аж да поўнага спынення і пры наяўнасці пешаходаў саступіць ім дарогу». А пешаходам жыццёва важна запомніць, што згодна з патрабаваннямі пункта 18.4 Правілаў дарожнага руху, забараняецца «выходзіць на праезную частку дарогі з-за транспартнага сродку, які стаіць, ці іншага аб'екта, які абмяжоўвае агляднасць дарогі, не пераканаўшыся ў адсутнасці транспартных сродкаў, якія набліжаюцца».

Паверце, сваімі правапаслухмянымі дзеяннямі вы выратуеце не толькі жыццё і здароўе пешахода, але і свой лёс.

**Вольга СУВОРАВА, ст. інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Савецкага РУУС г. Мінска.**



# НЕ ЦЫГАРЭТА, А... ЭСТАФЕТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пасля вядомага аб'яднання станаўленне цяперашняга «Беларусбанка» пачалося ў 1996 годзе, тады ж з'явіліся новыя падыходы, стаў фарміравацца па сутнасці новы калектыў, — адзначае старшыня аб'яднанай прафсаюзнай арганізацыі банка Наталля Петрачкова. — Прычым у гэтым плане вялікую ролю адыграла стаўка на сацыяльныя праграмы, і ў тым ліку — на спорт, дзякуючы якому мацнее карпаратыўны дух, паляпшаецца ўзаемаразуменне, раскрываюцца таленты, павышаецца працаздольнасць. Да слова, усе дзесяць гадоў нашы турзлёты праходзілі ў розных рэгіёнах Беларусі, і такая практыка ўзнікла невыпадкова — гэта дазваляе яшчэ лепш пазнаць нашу краіну і нашых людзей, атрымаць добрую энергетыку для нібыта сухой, але вельмі цікавай банкаўскай работы.

Стаўленне да спорту і ладу жыцця тут было асаблівым заўсёды, аднак менавіта цяпер з'явіліся і новыя напрамкі. Сёлета, у Год здароўя, праходзяць поўныя медыцынскія абследаванні работнікі банка. Прынята рашэнне аб забароне курэння на працоўных месцах. А ў будучым мяркуецца распачаць яшчэ адну даволі цікавую акцыю — запрасіць урачоў і... аказаць дапамогу ўсім тым, хто хацеў бы адмовіцца ад тытунёвай звычкі, але зрабіць гэта самастойна не можа.

— Ужо падчас прыёму на працу мы спрабуем вызначыць спартыўныя прыярытэты, — працягвае Наталля Петрачкова. — А потым прапануем: ёсць жаданне наведваць басейн, займацца аэробікай, футболам, валейболам, хакеем ці тэнісам — калі ласка, усе выдаткі аплаціць прафкам. І стымул спрацоўвае — ужо сёлета колькасць нашых спартыўных секцый павялічылася амаль на трэць.

Уласныя спартыўныя пляцоўкі, залы і санаторыі — аргументы таксама не апошнія. Пры гэтым, як паведаміў намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Іван Козел, у будучым у раёне праспекта Дзяржынскага сталіцы плануецца пабудаваць сучасны спартыўны комплекс з басейнам.



Найперш ён будзе разлічаны на работнікаў банка — іх колькасць у горадзе складае каля 6 тыс. чалавек. Але цалкам верагодна, што карыстацца новым аб'ектам будуць і іншыя мінчане.

Дарэчы, нялішне заўважыць, што «Беларусбанк» традыцыйна ўкладвае значныя сродкі ў развіццё спартыўнай інфраструктуры краіны, аказвае спонсарскую дапамогу ў правядзенні самых розных нацыянальных і міжнародных спаборніцтваў. А зусім нядаўна, напярэдадні летніх Алімпійскіх гульняў у Пекіне, банк стаў афіцыйным партнёрам Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Прычым у сваю чаргу не застаўся ўбаку і НАК, які прадаставіў удзельнікам турзлёту чатыры спецыяльныя прызы — «За алімпійскі характар», «За волю да перамогі», «Самаму моцнаму і вынослівому», а таксама «За знаходлівасць і кемлівасць».

...Памыляецца той, хто думае, нібыта банкір ведае толькі лічбы: перацягванне каната, валейбол, модны зараз пейнтбол, аэробіка — справы тут добра знаёмыя. Асобны турнір-мнагабор'е быў падрыхтаваны для кіраўнікоў. Зрэшты, не меншым відовішчам стала камбінаваная эстафета з пераадоленнем перашкод па-пластунску, кіданнем мяча ў карзіну і скокамі ў мяшках. А добрым «гарнірам» да ўсяго гэтага аказаліся кулінарны паядынак (прыгатаванне страў з абсалютна аднолькавых набораў прадуктаў), конкурс «Спяваючы офіс», прэзентацыя турысцкіх лагераў, спаборніцтва ў музычным экспромце... Словам, было ўсё: і фантазія, і азарт, і ўпартая барацьба, і свае пераможцы. У прыватнасці, першае месца ў агульнакамандным заліку заняў сталічны філіял № 527, другое — каманда цэнтральнага апарату, а трэцяе — філіял № 529. Не было толькі прайграўшых, бо ў адрозненне ад вялікага спорту тут быў і застаецца зусім іншы прынцып: галоўнае — удзел.

На мінулыя выхадныя на турыстычны злёт сабраліся не толькі мінчане, у гэтыя ж дні аналагічныя спаборніцтвы сярод работнікаў «Беларусбанка» прайшлі таксама ў Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай абласцях. А значыць, наперадзе не менш адметная і зноў-такі традыцыйная падзея — злёт рэспубліканскі. Сёлета ён пройдзе з 25 па 27 ліпеня каля возера Гаць пад Баранавічамі.

**Сяргей ГРЫБ.**

### У КОСАВА ЗНОЙДЗЕНЫ СТАРАЖЫТНЫЯ МАНЕТЫ

Расійскія манеты 20—40-х гадоў XIX стагоддзя (дзве сярэбраныя і сем медных) знайшлі студэнты Брэсцкага дзяржуніверсітэта ў час археалагічных раскопак у Косаўскім палацы (Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці). Аб гэтым паведаміў выкладчык універсітэта, вядучы спецыяліст па археалогіі прадпрыемства «Брэстрэстаўрацыяпраект» Аляксандр Башкоў.


Фота БЕЛТА.

**БЕЛТА.**

**ОАО «Красный Октябрь»**
**извещает акционеров о проведении**
**15 августа 2008 года в 12.00**
**внеочередного общего собрания по адресу:**
**г. Витебск, проспект ген. Людникова, 10.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О выборах Наблюдательного совета ОАО «Красный Октябрь».
2. Утверждение условий вознаграждения членам Наблюдательного совета.
3. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в читальном зале библиотеки с 8 августа 2008 года в рабочие дни с 11.00 до 16.00.

Регистрация участников собрания будет производиться с 10.00 до 11.45 на основании документа, удостоверяющего личность (представитель акционера должен иметь доверенность).

Дата составления списка акционеров для регистрации участников собрания — 1 августа 2008 года.

**Справки по тел.: (8 0212) 24 77 19.**

УНП 300003144 **Наблюдательный совет ОАО «Красный Октябрь».**

**Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельтранснафта «Дружба» Аляксея Аляксеевіча КАСЦЮЧЭНКІ і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.**

## Абзац

■ **Больш за 700 чалавек працуюць на ліквідацыі наступстваў урагану ў Бярэзінскім раёне — энергетыкі, дарожнікі, будаўнікі, леснікі з пяці раёнаў Мінскай вобласці. У ноч на 15 ліпеня на раён абрушыўся шквалісты вецер, хуткасць якога дасягала 18 метраў у секунду. Пацярпелі 381 жылы дом, 443 гаспадарчыя пабудовы ў прыватным сектары. Вялікі ўрон нанесены таксама 60 вытворчым будынкам. На 13 фермах на канец наступнага дня адсутнічала электрычнасць. Выведзена са строю 9 АТС, без тэлефоннай сувязі засталіся 43 населеныя пункты. Пашкоджана 50 км ліній электраперадач. Моцны вецер вывеў таксама са строю 222 трансфарматарныя падстанцыі ў Столінскім і Лунінецкім раёнах. Ад пападання маланкі ў гэтых раёнах зафіксаваныя 4 пажары.**

■ Участковы інспектар міліцыі Бярозаўскага РАУС прымяніў табельную зброю, каб абараніць педагогаў ад няўдалых бацькоў. Міліцыянер зрабіў 5 стрэлаў з пісталета ў паветра, калі члены камісіі па справах няпоўнагадовых прыйшлі забраць 3-гадовае дзіця ў няўдалых бацькоў. П'яныя бацькі сталі пагражаць членам камісіі сякерай і нажом, але пасля стрэлаў яны спынілі супрацьпраўныя дзеянні. Праверку праводзіць пракуратура.

■ **На станцыі метро «Інстытут культуры» затрыманы мінчанін, у якога выяўлены гашыш і амфетамін. Узбуджана крымінальная справа.**

■ У нядзелю, 13 ліпеня, у кіеўскім раддоме адбылася ўнікальная падзея — 57-гадовая жанчына нарадзіла хлопчыка. Галоўурач бальніцы асабіста прымала роды, прайшлі яны паспяхова. Мама адчувае сябе выдатна, а яе сын Андрэй (вага 3900) абсалютна здаровы і моцны хлопчык. Жанчына спакойна, без ускладненняў і «захаванняў» данасіла дзіця, сама прыйшла ў канцы тыдня ў раддом. Самая старэйшая парадзіха Украіны займаецца спортам, не п'е і не курыць. І ўсё ж урачы падкрэсліваюць, што роды ў такім узросце — вялікая рызыка.

■ **У Вісконсіне пілот разбіў свой верталёт пасля ўкусу пчалы. Ён апырскваў з паветра плантацыю журавін. Для апылення журавін на плантацыі стаяла некалькі пчаліных вулляў, і адну пчалу зацягнула патокам паветра ў кабіну 65-гадовага пілота. Насякомае ўджаліла яго, і на секунду згублены кантроль прывёў да таго, што хваставы вінт машыны, якая знаходзілася за паўтара метра ад зямлі, урэзаўся ў яе. У выніку верталёт быў сур'ёзна пашкоджаны. Аднак пілот выжыў.**

■ Госці на вяселлях у Тэль-Авіве могуць вельмі проста зрабіць дастойны падарунак жаніху і нявесце — там, дзе праходзяць гэтыя ўрачыстасці, дадумаліся паставіць банкаматы. Дастаткова ўставіць крэдытную картку ў аўтамат і падарыць маладым грашовую суму ў электронным выглядзе. Гэта першыя падобныя машыны ў Ізраілі і ў свеце. Гэта вельмі зручна, лічаць арганізатары паслугі, бо госць можа зрабіць падарунак нават тады, калі ён забыў дома чэкавую кніжку. За новаўвядзенне, праўда, давядзецца заплаціць — арэнда аўтамата абыдзецца шлюбнікам у 500 шэкеляў, але затое яны пазбаўленыя нуднай неабходнасці падліку грошай і доўгіх чэргаў да касы банкаў.

## Поўны абзац

■ **У Еўрасаюзе пачалі барацьбу з кур'ёзнымі нормамі і прадпісаннямі, якія еўрачыноўнікі самі і ўстанавілі. Аказалася, што ў Бруселі існуюць нормы, якія рэгулююць даўжыню агуркоў і прэзерватываў, крывізну бананаў, акругласць яблыкаў. Эксперты мяркуюць, што чыноўнікі праяўляюць празмерную актыўнасць у зусім непрадукцыйных пытаннях і ствараюць у зоне ЕС атмасферу бюракратызацыі, якая адштурхоўвае многіх, у тым ліку і ў краінах-удзельніцах. Еўрачыноўнікі дабраліся нават да інтымнай сферы, прызнаўшы прэзерватыў медыцынскім прыстасаваннем і распаўсюдзіўшы на яго строгія правілы: «Даўжыня павінна складаць не менш за 160 мм, а шырыня не павінна адрознівацца ад намінальнай больш чым на 2 мм».**

■ Аўстралійскі суд прыгаварыў жыхара Сіднэя, аматара піва, які ў сёмы раз затрыманы паліцэйскімі пры ваджэнні аўтамабіля ў нецвярозым стане, да ўстрымання ва ўжыванні і нават набыцці любімага напою на тэрмін 12 месяцаў. Будаўнік Майкл Ліры прызвычаіўся да празмернага ўжывання піва пяць гадоў таму, пасля таго, як яго пакінула сяброўка. Няшчасны будаўнік траціў каля тысячы долараў у тыдзень. Суд не прыгаварыў Майкла да турэмнага зняволення, спаслаўшыся на той факт, што ён — бацька чацвярых дзяцей і практычна пазбавіўся прывычкі празмерна ўжываць піва з моманту апошняга затрымання. Замест гэтага суд пазбавіў яго права ўжываць, купляць і нават трымаць у руках піва.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**«ВРЕМЯ ПОБЕЖДАТЬ С МТБанком!»**

ЗАО «Минский транзитный банк» определил третьего победителя рекламной игры «Время побеждать с МТБанком!». Обладателем телевизора Philips, который был разыгран среди клиентов, пользующихся услугами интернет-банкинга «Мой банк», стал **Александр Протченко.** Поздравляем победителя!

Рекламная игра «Время побеждать с МТБанком!» проводится с 8 декабря 2007 до 1 августа 2008 года. Свидетельство Министерства торговли № 911 от 7 декабря 2007 года о государственной регистрации правил проведения рекламной игры ЗАО «Минский транзитный банк».

*Лицензия НБ РБ № 13 на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 г. УНН 100394906.*

**Страховые свидетельства** ЗАСО «Белнефтестрах» АД № 8434478—8434480; АД № 8506417—8506420; АД № 8525449—8525450; АЖ № 679400 **считать недействительными.**

## Карысныя прадукты

# Вып'ем какавы... за какаву!

**Галандскія даследчыкі сцвярджаюць: штодзённы кубак гарачай какавы істотна ўплывае на працягласць жыцця сталых людзей.**

Лічыцца, у прыватнасці, што апантаныя аматары какавы ў два разы радзей паміраюць ад сардэчна-сасудзістай паталогіі ў параўнанні з тымі, хто ігнаруе гэты прадукт у прынцыпе. Больш за тое, ужыванне какавы спрыяе фарміраванню больш рацыянальных дыетычных звычак. Мужчыны пры гэтым менш ядуць мяса, тлустых гатункаў малочных прадуктаў, радзей захапляюцца салодкімі дэсертамі і пячэннем, а аддаюць перавагу арэхам і ўмеранаму ўжыванню алкаголю. Вучоныя схільныя тлумачыць лекавыя вартасці какавы прысутнасцю ў ёй флавану, які зніжае артэрыяльны ціск, павышае трываласць сасудзістай сценкі і змяншае ўтрыманне небяспечных для здароўя тлушчаў у сыроватцы крыві.

Амерыканскія ж вучоныя выйшлі ў какаве яшчэ адно рэчыва — эпікатэхін, які, паводле меркавання апошніх, настолькі важны для арганізма, што яго варта прызначаць як вітамін.

Адзін з вышэйпамянёных даследчыкаў доўгія гады вывучаў карысныя вартасці какавы, якую п'юць у мястэчку Куна, што ў Панаме. Ён выявіў, што рэгулярнае ўжыванне напою на 10 працэнтаў скарачае ў мясцовых жыхароў рызыку чатырох захворванняў — сардэчнага ўдару, прыпынення сэрца, раку і цукровага дыябету. Панамскае насельніцтва можа выпіць за тыдзень да 40 кубкаў натуральнай какавы, якая мае высокі ўзровень эпікатэхіну.

На бягучы момант гэта рэчыва не падтрымліваецца навуковай садружнасцю так, як флаванол, істотная роля якога лічыцца даказанай. Тым не менш вынаходнікі эпікатэхіну маюць на мэце ажыццявіць больш маштабныя даследаванні. Наогул такія фалаванолы, як эпікатэхін, не прысутнічаюць у звычайнай какаве, паколькі яны надзвычай горкія на смак. Аднак амерыканскія вучоныя спадзяюцца, што іх адкрыццё падштурхне да развіцця вытворчасці гэтага рэчыва ў якасці харчовай дабаўкі.

Эпікатэхін знойдзены таксама ў гарбаце, віне, шакаладзе і невялікай колькасці садавіны і гародніны.

Ці ведаеце вы, што з аднаго дрэва какавы можна сабраць каля 2 кілаграмаў сырых бабоў у год? Насенне, якое выдаляецца з пладоў, мае горкі і вяжучы смак, што абумоўлена вялікай колькасцю дубільных рэчываў. Для таго, каб трапіць у шакалад, ім даводзіцца прайсці спецыяльную падрыхтоўку.

Сырыя какава-бабы засыпаюць у кашы, накрываюць бананавым лісцем і пакідаюць на 5—6 дзён. На спякоце пачынаецца браджэнне, тэмпература ў карзіне павышаецца да 50 градусаў С, а хімічны склад бабоў перажывае складаныя змяненні. Гэты працэс называецца ферментацыяй. У выніку бобавыя страчваюць да 65 працэнтаў ад сваёй першапачатковай вагі, вільготнасць іх змяншаецца да 6 працэнтаў. Колер бабоў змяняецца ад фіялетавага да карычневага, яны набываюць характэрны шакаладны водар. Ад таго, як быў праведзены працэс ферментацыі, і залежыць, наколькі смачным і якасным будзе шакалад.

Какава-бабы вылучаюцца складаным хімічным саставам. У іх прысутнічаюць бялкі, вугляводы, арганічныя кіслоты, дубільныя, фарбавальныя, мінеральныя і пахкія рэчывы. Акрамя таго, какава ўтрымлівае алкалоіды: тэабрамін і кафеін. Апошні аказвае ўзбуджальнае дзеянне на цэнтральную нервовую і сардэчна-сасудзістую сістэмы. Тэабрамін здымае спазмы сасудаў сэрца і галаўнога мозга. Устаноўлена, што тэабрамін — эфектыўны сродак ад кашлю, асабліва на пачатковых стадыях прастуды.

Какава-бабы з'яўляюцца каштоўнай сыравінай як для шакаладных фабрык, так і для фармацэўтычнай, касметычнай і парфумернай вытворчасцяў.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Кватэрнае пытанне

# НЕ ТАК ВАЖНА, ХТО ПЛАЦІЎ...

***Мы са сватамі дапамаглі дзецям пабудаваць кватэру. У ёй, трохпакаёвай, агульнай плошчай 70 квадратных метраў, жывуць цяпер чатыры чалавекі, і афармлена яна на нашу дачку. Зяць жа па-ранейшаму прапісаны ў сваіх бацькоў. Метраў там не хапае. Ці можа ён стаць на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.***

**Г.Я.**, *г. Гродна*

Згодна з арт. 259 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь маёмасць, нажытая мужам і жонкай у шлюбе, знаходзіцца ў іх сумеснай уласнасці, калі дагаворам паміж імі не ўстаноўлены іншы рэжым гэтай маёмасці. Прычым у адпаведнасці з арт. 23 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ўказаная маёмасць з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю незалежна ад таго, на каго (мужа ці жонку) яна набытая або кім (мужам ці жонкай) унесены сродкі. Муж і жонка маюць роўныя правы валодання, карыстання і распараджэння гэтай маёмасцю, калі іншае не прадугледжана шлюбным дагаворам.

Такім чынам, муж, які прапісаны ў сваіх бацькоў, а фактычна пражывае са сваёй сям'ёй у кватэры, набытай і афармленай ва ўласнасць на жонку, мае паводле закона не толькі права пражывання ў гэтай кватэры, але і павінен быць зарэгістраваны (прапісаны) па месцы фактычнага пражывання.

Што датычыцца прыняцця мужа на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то дзеючае жыллёвае заканадаўства не прадугледжвае пастаноўкі на ўлік толькі аднаго з членаў сям'і. Сям'я (у поўным складзе) мае права стаяць на такім уліку па месцы жыхарства, а таксама па месцы работы (службы) кожнага яе члена. Альбо не мае.

**Віктар САВІЦКІ.**

## Суседзі

# У БЕЛАСТОКУ АДКРЫТЫ ПЕРШЫ КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР БЕЛАРУСІ ЗА МЯЖОЙ

**Беласток сустрэў гасцей з Беларусі (з Міністэрства культуры, Брэсцкага і Гродзенскага аблвыканкамаў, артыстаў, журналістаў) пранізлівым, падобным на восеньскі, дажджом. Але ён не здолеў азмрочыць цёплую, сяброўскую атмасферу, што панавала на ўрачыстай вечарыне з нагоды адкрыцця Культурнага цэнтра нашай краіны ў Польшчы. На ім прысутнічалі кіраўнікі гарадской адміністрацыі, дзеячы культуры, адукацыі, святары, шмат прадстаўнікоў беларускай дыяспары і, вядома ж, нашы дыпламаты.**

Шэрагу вядомых грамадскіх дзеячаў, прадстаўнікоў беларускай меншасці за шматгадовую дзейнасць па падтрымцы беларускай культуры і адукацыі ў Польшчы, развіццю беларуска-польскіх культурных сувязяў былі ўручаны Ганаровыя граматы Міністэрства культуры і Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Беларусі. А сярод падарункаў цэнтра — кніга «Спадчына Беларусі», гісторыя беларускай культуры на DVD-дысках.

— Упершыню наша краіна адкрывае за мяжой свой цэнтр як дзяржаўную культурную ўстанову, — гаворыць пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка. — І вельмі важна, што ён адкрываецца ў Польшчы — у краіне, з якой Беларусь мае багатую сумесную гісторыка-культурную спадчыну, і менавіта ў Беластоку, дзе найбольш прадстаўнікоў беларускай дыяспары.

— Гэты цэнтр быў марай беларускіх дыпламатаў, — адзначае Генеральны консул Беларусі ў Беластоку Міхаіл Аляксейчык. — Мы хацелі, каб на больш высокім узроўні пачаўся паказ нашай беларускай культуры, а таксама навукі, спорту жыхарам Польшчы. Каб яны зразумелі, што тыя перашкоды, якія хтосьці стараецца паставіць паміж нашай дзяржавай і Еўропай — рэчы штучныя. Трэба рухацца толькі ў кірунку супрацоўніцтва.

Дзверы цэнтра будуць адчыненыя для ўсіх — і для беларусаў, якія тут пражываюць, і для палякаў, і для прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў.

— Рашэнне аб стварэнні гэтага цэнтра паказвае, што Беларусь адкрыта для добрага супрацоўніцтва паміж нашымі народамі і дзяржавамі, — падкрэслівае кіраўнік нашай дыпламатычнай місіі ў Польшчы. — Бо зразумела, што культура сама па сабе нясе добрае. І мы з гэтым добрым прыходзім да нашых суседзяў — палякаў. Мы хочам паказаць тое багацце, якое ў нас ёсць, багацце нашай душы і нашага сэрца. Упэўнены, што праз культурныя мерапрыемствы, якія будзе арганізоўваць цэнтр, мы будзем спрыяць нармалізацыі, добраму развіццю беларуска-польскіх адносінаў.

Такім чынам, Беларусь хоча на сістэмнай аснове прадстаўляць сваю культуру ў Польшчы. А тое, што яна вельмі запатрабаваная нашымі суседзямі, пацвярджае хоць бы адзін факт. Напрыканцы чэрвеня ў Зале кангрэсаў Палаца навукі і культуры, на самай вялікай і прэстыжнай пляцоўцы ў Варшаве выступіў з канцэртнай праграмай Нацыянальны акадэмічны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча. Выступленне славутага калектыву (папярэдні канцэрт адбыўся ў польскай сталіцы ажно 25 гадоў таму) было арганізавана па ініцыятыве беларускага пасольства пры садзейнічанні гарадской управы Варшавы і фінансавай падтрымцы прадстаўніка знакамітага роду Вялікага княства Літоўскага Караля Радзівіла. Кожны нумар (былі выкананы беларускія, польскія, рускія песні) вельмі цёпла прымаўся публікай, а пасля канцэрта гледачы стоячы некалькі разоў выклікалі калектыў пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхася Дрынеўскага на сцэну. Людзі падыходзілі да супрацоўнікаў беларускага пасольства з падзякай за выдатную магчымасць бліжэй пазнаёміцца з самабытным беларускім мастацтвам. З такім жа вялікім поспехам прайшлі канцэрты хору ў гарадах Радзынь Падляскі і Гарвалін.

А на свяце з нагоды адкрыцця Культурнага цэнтра Беларусі, як кажуць, «запальвалі» яшчэ два знакамітыя, улюбёныя ў беларускую песню творчыя калектывы — «Прымакі» з Беласточчыны і «Бяседа» з Мінска. Зала не толькі апладзіравала, але і спявала разам з імі.

— Як вам, карэннаму жыхару Беласточчыны, удаецца так прыгожа спяваць па-беларуску? — цікаўлюся ў кіраўніка ансамбля «Прымакі», дырэктара аддзела культуры ў Гарадку Юрыя Астапчука.

— Гэта, напэўна, плён канцэртаў. Мы выступаем не толькі ў Польшчы, але і ў Беларусі, вучымся ў калег, у таго ж ансамбля «Бяседа», пішам і сваю музыку. Так і паўстаў рэпертуар. Члены нашага аматарскага калектыву працуюць у розных фірмах, але што нас аб'ядноўвае, дык гэта беларуская песня, тая чыстая, з глыбіні сэрца энергія, якая заўсёды з намі на сцэне. Мяне вельмі цешыць, што да беларускай культуры прыязна ставяцца не толькі на Беласточчыне, дзе жыве найбольш людзей беларускай дыяспары, але і ў іншых рэгіёнах Польшчы, а таксама за мяжой, куды мы выязджаем з канцэртамі. Я вельмі ўдзячны за падтрымку паслу Беларусі Паўлу Латушку, генеральнаму консулу Міхаілу Аляксейчыку.

— Якія надзеі ўскладаеце на Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы?

— Абавязкова трэба, каб быў гэты цэнтр. У ім неабходна сабраць ад дзядоў, якія яшчэ жывуць, усю гісторыю беларускай меншасці ў Польшчы. Тады будзе велізарная крыніца і для маладых людзей, і для старэйшых, якія ведаюць гэту гісторыю, але не да канца. Акрамя таго, з'явяцца новыя магчымасці для таго, каб беларуская культура знаёміла ўсіх зацікаўленых людзей са сваёй ідэяй. Дарэчы, неўзабаве ў нас адбудзецца вялікая імпрэза «Сяброўская бяседа», чакаецца прыезд ажно сямі калектываў з Беларусі.

— Як ставіцеся да ідэі правядзення ў Беларусі фестывалю для суайчыннікаў, якія жывуць ў замежжы?

— Вельмі станоўча. Гэта будзе вялізная падтрымка для ўсіх беларусаў, што жывуць за межамі сваёй гістарычнай Радзімы.

Падтрымлівае гэту ідэю, якая нядаўна была агучана ў Гродне на VII Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, і старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Ян Сычэўскі:

— Заўсёды да такіх прапаноў стаўлюся вельмі пазітыўна. Палітычныя погляды беларусаў у свеце неаднолькавыя, але павінны быць нейкія супольныя ідэі. І галоўнай з іх з'яўляецца культура, якая збліжае людзей і душэўна, і духоўна, спрыяе вынаходству нейкіх агульных ідэй, развіццю ўзаемных кантактаў. А гэта заўсёды ўзбагачае і кожнага чалавека, і дыяспары, якія пражываюць у розных краінах свету.

Ян Сычэўскі кажа, што асабіста вельмі глыбока перажывае тыя цяжкасці, якія сёння існуюць у беларуска-польскіх адносінах, не маючы, на яго думку, нейкіх аб'ектыўных палітычных прычын. А гэта адмоўна адбіваецца ў тым ліку і на развіцці культуры, рэалізацыі праграмнай дзейнасці беларускай дыяспары.

— Цэнтр, які сёння адкрыты, будзе ўплываць на ўзбагачэнне гэтых кантактаў, дапамагаць культурнай дзейнасці беларусаў у Польшчы, — перакананы Ян Сычэўскі.

Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка падкрэсліў, што апошнім часам назіраецца большая прагматызацыя ў беларуска-польскіх адносінах. Прыйшло разуменне таго, што, як у суседзяў, у нас ёсць шмат агульных спраў, якія трэба вырашаць — і на мяжы, і ў эканоміцы, у галіне інвестыцый, і, зразумела, у турыстычнай, культурнай сферах. І адкрыццё Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы — яшчэ адна прыступка да ўзаемаразумення.

Гэта, дарэчы, толькі пачатак працы па прапагандзе беларускай культуры за мяжой. Паводле інфармацыі начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі Васіля Чэрніка, такія цэнтры плануецца стварыць у Расіі, Літве, ва Украіне, у Ізраілі, а, мажліва, нават у Аўстраліі.

Ёсць імкненне і да пашырэння міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Сесія Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў нядаўна зацвердзіла праграму развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносінаў і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2008—2010 гады. У прыватнасці, плануецца прадоўжыць правядзенне штогадовых традыцыйных фестываляў «Артыстычныя сустрэчы «Беласток—Гродна», «Гродна—Беласток». Беларускія мастацкія калектывы ў Польшчы будуць забяспечвацца сцэнічнымі касцюмамі і музычнымі інструментамі, рэпертуарна-метадычнымі дапаможнікамі, а публічныя бібліятэкі ў Беластоку і Сувалках — беларускай мастацкай літаратурай. Прадоўжыцца і дапамога навучальным установам Польшчы, дзе вывучаецца беларуская мова, у забеспячэнні іх вучэбна-метадычнымі, даведачнымі, мастацкімі кнігамі, а таксама сродкамі навучання — геаграфічнымі картамі, плакатамі, матэрыяламі па гісторыі Беларусі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*г. Беласток.*

## Пытальнік

# Сітуацыя з водаправодам у Саракоўшчыне — на кантролі

**Паважаная рэдакцыя! Сутнасць нашай праблемы ў наступным. Быў у нас водаправод, неяк працаваў, хоць вада цякла дрэннай якасці, але мы мірыліся з такім становішчам рэчаў. Пакуль дырэктар саўгаса не адключыў водаправод, маўляў, каровам вада патрэбная, а вам навошта. Крыўдна, што састарэлыя людзі аддалі таму кароўніку 50 гадоў жыцця, а ў выніку нават вады ў кране не заслужылі. Адна бабка пайшла па ваду да калодзежа, набрала вады і павалілася ад цяжару, заплакала. Я, вядома ж, ёй дапамог, але на душы застаўся асадак. А райвыканкам увесь час дае адзін адказ: «Няма грошай».**

**Алег Бугрэеў,** *в. Саракоўшчына Ўздзенскага раёна.*

Ліст чытача, напісаны ім ад імя жыхароў вёскі, па пытанні работы водаправодных сетак быў разгледжаны ва Ўздзенскім райвыканкаме.

«Накіравана прадпісанне РУП «Уздзенская ЖКГ» і ВРУП «Эксперыментальная база імя Катоўскага» з просьбай праверыць водаправодныя сеткі і правесці іх рамонт.

Па ўказанні дырэкцыі ВРУП «Эксперыментальная база імя Катоўскага» вада ў вёсцы Саракоўшчына не адключалася. Факт нетактычных паводзінаў дырэктара ў дачыненні да жыхароў вёскі не ўстаноўлены. Дадзенае пытанне знаходзіцца на кантролі ва Ўздзенскім райвыканкаме».

# Вось дык пасадзейнічаў...

**Набыўшы ў Польшчы тавар, аптавікі, каб не плаціць пошліну, нярэдка карыстаюцца паслугамі шэрагу вадзіцеляў, якія і перавозяць яго праз мяжу як уласны. Зразумела, за пэўнае ўзнагароджанне ад сапраўднага ўладальніка гэтага тавару. Але на такой здзелцы можна і пагарэць, як гэта нядаўна здарылася з адным гродзенцам.**

Каб увезці ў Беларусь набытыя ў Польшчы ноўтбукі, ён перад шлагбаўмам раздаў іх некалькім чаўнакам. Аднак пасля пераадолення пункта мытнага афармлення ў Брузгах адзін ноўтбук да свайго гаспадара не вярнуўся. Справа ў тым, што яго гаспадаром назваўся зусім іншы чалавек. І забраў каштоўную рэч. Цяпер яго шукаюць праваахоўнікі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**




**Сёння пачну словамі: «Адкрыйце для сябе кабачок!» Дыетолагі даўно здымаюць перад кабачком капялюш. Мала таго, што ў ім шмат калію, ёсць яшчэ і натрый, кальцый, магній, фосфар, медзь і жалеза, набор арганічных кіслотаў, вітаміны С, $B_1$, $B_2$, дык яшчэ і прапорцыі натрыю і калію вытрыманыя практычна ідэальна (1:100). Для тых, хто клапоціцца аб фігуры, ёсць таксама прыемная навіна — у 100 г свежых кабачкоў усяго толькі 27 кілакалорый. Да ўсяго з іх можна рабіць цудоўныя маскі для твару. І таму вельмі крыўдна, што кабачок лічыцца недалікатэснай стравай: у рэстаранным меню яго сустрэнеш рэдка. Затое італьянскі брат кабачка — цукіні — даўно асталяваўся ў меню высокай кухні. Будзем змагацца за айчынны прадукт і давайце ўпэўнімся, што з кабачка можна прыгатаваць і закуску, і першае, і другое, і дэсерт. Да таго ж (што часта немалаважна) каштуюць кабачкі зусім смешныя грошы.**

### САЛАТА З КАБАЧКОЎ

500 г невялікіх кабачкоў разрэзаць уздоўж на дзве палавінкі, а затым нарэзаць папярок у форме паўмесяца, буйныя кабачкі нашатковаць, затым прысыпаць соллю. Праз 10 хвілін, калі кабачкі трохі падвянуць, акуратна адціснуць. Калі адціскаць занадта моцна, смак салаты пагоршыцца. У каструлю ўліць 15 г алею, пакласці кабачкі і нядоўга патушыць на моцным агні (не адчыняючы накрыўкі). Калі яны будуць гатовыя, дадаць 20 г здробненай зялёнай цыбулі, 3 г падсоленага кунжуту, 1—2 зубчыкі маладога часнаку, змяшаць і зверху пасыпаць тонка нарэзаным чырвоным перцам (1шт.) або молатым чырвоным перцам.

### КАБАЧКОВЫ ТОРТ

Гэта ідэальная мужчынская страва, я нават сказала б закуска — пад піва, а то і пад гарэлачку (толькі памятайце, што злоўжыванне спіртным вельмі шкодзіць здароўю, працы і паразуменню ў сям'і).

__Для цеста вазьміце:__ 700—800 г ачышчаных кабачкоў, 2 яйкі, 1 чайную лыжку разрыхляльніку, 0,5 чайнай лыжкі солі, перац, каля шклянкі мукі, 2 сталовыя лыжкі крухмалу, 5 сталовых лыжак алею.

__Для соўса:__ 4 невялікія зубчыкі часнаку, 250 г маянэзу, 3 вараныя яйкі, 1 чайная лыжка солі

Ачышчаны ад насення і скуркі кабачок нацерці на сярэдняй тарцы (калі кабачок малады, то можна не чысціць). Пасаліць і пакінуць на 15 хвілін, каб ён пусціў сок. У атрыманую масу ўбіць яйкі, дадаць перац, разрыхляльнік, алей і крухмал. Пры жаданні ў цеста можна дадаць крыху здробненай зеляніны або балгарскага перцу. Паступова ўсыпаць столькі мукі, каб атрымалася даволі густое цеста. Пакінуць на 30 хвілін для набухання. Калі пасля гэтага цеста стала больш вадкім, г.зн. з кабачкоў выдзеліўся дадатковы сок, дасыпаць яшчэ мукі.

У патэльні разагрэць 1 сталовую лыжку алею, вылажыць 3 сталовыя лыжкі цеста і разраўняць яго па дне. Закрыць накрыўкай і пячы на агні крыху меншым за сярэдні каля 10 хвілін — да ўтварэння румянай скарыначкі. Блін перавярнуць і дасмажваць другі бок пад накрыўкай яшчэ хвілін 5. Перад выпечкай кожнага наступнага бліна ў патэльню наліваць 1 сталовую лыжку алею і награваць яго. З указанай колькасці прадуктаў выходзіць 5 бліноў дыяметрам 24 см (проста дыяметр маёй патэльні менавіта такі).

Гатовыя кабачковыя бліны добра астудзіць. У вараных яек аддзяліць бялкі ад жаўткоў. Жаўткі расцерці, а затым змяшаць з маянэзам.

Дадаць соль і прапушчаны праз прэс часнок. Таксама ў соўс можна дадаць невялікую колькасць дзёртага сыру. Бліны прамазаць атрыманым соўсам. Верх і бакі торта пасыпаць дзёртым бялком.

Пакінуць на 1 гадзіну для насычэння.

### КАБАЧКІ, ФАРШЫРАВАНЫЯ МЯСАМ, РЫСАМ І ЯЙКАМ

Фаршыраваць кабачкі можна чым заўгодна, існуе, напэўна, сотня разнавіднасцяў гэтай стравы. І заўсёды атрымліваецца вельмі смачна. Адзін з варыянтаў прапаную вашай увазе. Для тых, хто лічыць, што без мяса насыціцца немагчыма.

__Спатрэбіцца__: 2 невялікія кабачкі, 1 вялікая цыбуліна, 150 г ялавічыны або 200 г свініны, 1 шклянка рысу, 3 яйкі, зеляніна, 200 г смятаны, 1 сталовая лыжка мукі, 1 сталовая лыжка топленага масла, соль, перац на смак.

Падрыхтоўка фаршу. Прапусціць праз мясарубку мяса і смажаную цыбулю, дадаць загадзя звараны рыс, сечаныя вараныя яйкі, зеляніну. Пасаліць, паперчыць, уліць 1/2 шклянкі халоднай вады, усё добра перамяшаць.

Кабачкі разрэзаць напалову папярок, ачысціць ад скуркі, насенне дастаць лыжкай. Напоўніць фаршам, змясціць у глыбокую патэльню або нізкую каструлю, падліць трохі вады, каб кабачкі не падгарэлі і паставіць на 30 хвілін у нагрэтую духоўку. Пасаліць смятану, змяшаць з мукой і топленым маслам. Заліць гэтай сумессю кабачкі і даць ім яшчэ трохі запекчыся.

Перад падачай на стол асцярожна выкласці кабачкі на талерку, можна заліць іх смятанай і пасыпаць зелянінай.

### ЯДОМЫ АНЕКДОТ

*Наведвальнік у рэстаране кліча афіцыянта:*

*— Паслухайце! Курыца, якую вы мне падалі, нясвежая!*

*— Самі вінаватыя.*

*— Гэта чаму?*

*— Таму што я прапаноўваў вам яе ў мінулую сераду, а вы адмовіліся.*

## Дзённік фестывалю

# «МНЕ НЕ БЫЛО СОРАМНА...»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

..Прагучала фінальная песня ў выкананні ўсіх канкурсантаў, і за кулісамі пачалося стоўпатварэнне. Віталь Гардзей адразу пасля абвяшчэння балаў апошняй удзельніцы трапіў у шчыльнае кольца журналістаў. А як інакш: калі Гран-пры дастаецца літоўцу Данатасу Монтвідасу з яго недасяжнымі 210 баламі, то ў расіянкі Лены Валеўскай і беларуса Віталя Гардзея — абсалютна роўная колькасць балаў, па 201 — і падзеленае першае месца? Ёсць з чым павіншаваць!

— Нават не памятаю, хто мне паставіў «дзесяткі», — узбуджана тараторыць Віталь. — Расія? Дзякуй Алегу Газманаву, не чакаў! Ад любога з членаў такога журы прыемна атрымаць 10.

**— Задаволены?**

— Вельмі. Хоць для мяне балы — не самае галоўнае. Важна, што я сёння атрымаў такі кайф ад выступлення! Я адчуваў сябе больш упэўнена, чым у першы дзень, і гэта адбілася на ацэнках. Мяне павіншавала Ірына Дарафеева, і ўпершыню ў жыцці пахваліў Юрый Саваш, што было таксама надзвычай прыемна. Не буду паўтараць, што менавіта ён сказаў, але пачуць такое — дарагога каштуе. Вельмі добрыя, цёплыя і патрэбныя словы.

**— У першы дзень па выніках ты ўваходзіў у пяцёрку лідараў, але, як нам здалося, быў крыху незадаволены з-за ацэнак?**

— Быў, але не з-за ацэнак. Проста, выступаючы з аркестрам, я перахваляваўся, бо адчуваў адказнасць не толькі за самога сябе, але і «за таго хлопца». Не тое каб былі накладкі — я цалкам давяраю аркестру Фінберга — але празмернае хваляванне дало аб сабе знаць. Гэта натуральна падчас любога жывога выступлення, але ўсё ж — конкурс, нервы... На гэты раз усё залежала ад мяне, я пастараўся сабрацца. Словам, мне не сорамна за сябе і за бескарысна пражытыя гады. (*Смяецца*.)

У гэты час падаспелі новыя віншаванні — намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка стрымана пацiснуў маладому выканаўцу руку і пахваліў: «Малайцом!». Затое мама Віталя, кіраўнік бабруйскага тэатра песні «Шынанай» Ала Ефіменка, спусціўшыся з залы, не хавала захаплення і расчулена абняла сына.

**— Цябе падтрымлівала толькі мама?**

— Так, тата застаўся дома. Аднак затое яшчэ мяне падтрымліваў старэйшы таварыш, з якім я пазнаёміўся некалькі дзён таму — і цяпер магу сказаць, што вельмі палюбіў Чэхію, хоць быў там даволі даўно. Там цудоўныя людзі!

**— Ці звярнуў ты ўвагу, што ў вас з малдаўскім канкурсантам Віцем Баланам аднолькавыя касцюмы?**

— Я ў сваім, памятаеш, выступаў яшчэ ў першы дзень. Я ўвогуле не прыхільнік таго, каб здзіўляць публіку якімі-небудзь выдумкамі на галаве ці ў вобразе. Проста мне ў ім зручна, камфортна. Тым больш, у першы дзень ён прынёс мне хоць маленькую, ды ўдачу — і я вырашыў касцюм не мяняць. Дый журы, лічу, калі бачыць удзельніка то ў адным касцюме, то ў другім — не запамінае самога выканаўцу. Што да Віктара Балана — ён сам быў у шоку, калі ўбачыў, наколькі мы падобна апранутыя. Мы тут ужо нават прыдумалі легенду, што хлопцу спадабаўся мой касцюм, ён пабег у краму і хуценька купіў сабе гэткі ж самы. (*Смяецца*.) Насамрэч Віктар — класны хлопец, і я лічу, што спяваў ён выдатна.

**— Каго яшчэ з канкурсантаў ты для сябе вылучыў бы?**

— Літоўца, натуральна. Нездарма менавіта ён атрымаў адзіную «дзесятку» ад старшыні журы. Юля — я называю яе Юля, так больш звыкла — з Нідэрландаў: яна вельмі пазітыўны чалавек, сапраўдны, шчыры. Добрыя хлопцы з Балгарыі, з Малдовы, з Узбекістана, з Азербайджана (хоць ён і не трапіў у фінал). Вось, не пакрывіўшы душой, сцвярджаю — яны ўсе класныя! І мы так пасябравалі, што большасць вырашылі застацца ў Віцебску да канца, так што, спадзяюся, мы яшчэ пагуляем па горадзе, пабудзем разам — і ўвогуле сустракаемся не ў апошні раз. Мне нават шкада, што ўсё ўжо скончылася і пайшоў адваротны адлік. Хацелася б затрымаць гэта адчуванне эйфарыі...

Вечарам у Віцебскай абласной філармоніі адбылося канчатковае падвядзенне вынікаў і «раздача сланоў» канкурсантам. Прычым незалежна ад атрыманых прызоў ва ўсіх іх так ззялі вочы, як быццам перамаглі ўсе 15. Вось што такое яна — фестывальная эйфарыя. Хочацца заразіцца і заразіцца гэтым адчуваннем як мінімум да наступнага «Славянскага базару». Ну а пакуль што — дзякуй, «Віцебск-2008», за дастаўленае задавальненне!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# «АМАЗОНКА» — ПРЭМ'ЕРА Ў ВІЦЕБСКУ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Народная артыстка Украіны Руслана (Ліжычка) — пераможца «Еўрабачання—2004», вельмі ўдзячна «базару» за тое, што менавіта ў Віцебску яна пачала свой «зорны» шлях. Тут у 1996 годзе яна стала ўладальніцай Гран-пры на міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў.

— Дзе б я ні была, калі сустракаюся з былымі ўдзельнікамі фестывалю, мы з задавальненнем успамінаем непаўторную атмасферу «базару», — сказала Руслана на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню культуры Украіны.

Менавіта ў Летнім амфітэатры ўвечар у гэты дзень адбылася прэм'ера поўнага шоу Русланы «Амазонка». Раней — у Баку, у Бялградзе і іншых гарадах публіка ўбачыла толькі частку «Амазонкі». А Віцебск як «творчая Радзіма» Русланы атрымаў першым такі шанц.

Амазонкі, аказваецца, жылі на берагах Дняпра і былі продкамі славян. Пра гэта расказаў прадзюсар спявачкі (па сумяшчальніцтве яе муж) Аляксандр Ксенафонтаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДЗЕНЬ ЦВЯРОЗАСЦІ

### УНІКАЛЬНАЯ ВІЦЕБСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА — НЕ ПІЦЬ СПІРТНОЕ І ПІВА ЦЭЛЫ ДЗЕНЬ!

**Яшчэ на мінулым тыдні на дзвярах мясцовых крамаў з'явіліся аб'явы пра тое, што 16 ліпеня спіртное, у тым ліку і слабаалкагольныя напоі, прадавацца не будуць.**

З самага першага дня правядзення «базару» пасля 16 гадзін спіртное ў цэнтры горада не знайсці. А цяпер аматарам выпіць будзе яшчэ больш цяжка. Дзень цвярозасці праводзіцца па ініцыятыве кіраўніцтва УУС Віцебскага аблвыканкама — спецыяльна ў Дзень культуры Беларусі. На плошчы 1000-годдзя ўвечары запланавалі сабраць подпісы ў забарону рэкламы піва па тэлебачанні. Праграма ўсіх мерапрыемстваў вельмі багатая: конкурсы на фігурнае ваджэнне веласіпеда, па катанні на ролікавых каньках, стральбе з пнеўматычнай зброі, армрэслінгу, дартсу. Цікава, што і байкеры (а які байкер без піва?) падтрымалі ідэю арганізатараў Дня цвярозасці — прадэманструюць майстэрства кіравання матацыкламі. Выступяць таксама клуб воінскіх мастацтваў «Берсек», міліцэйскія ВІА і аркестр. Міліцыя, дарэчы, будзе «апрацоўваць» установы грамадскага харчавання, рынкі і г.д., каб выявіць парушэнні ў продажы спіртнога. Легендарны змагар з п'янствам ксёндз — прэлат Мосарскага касцёла Ёзас Булька выступіць перад гасцямі незвычайнага свята: ён добра ўмее рэкламаваць здаровы лад жыцця. У праваслаўных і каталіцкіх храмах падчас службаў словы ў абарону цвярозасці скажуць святары.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ПАЎНОЧНЫЯ АЛЕНІ І БЕЛАРУСКІЯ МАТЫВЫ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора ўдзень зазірнулі ў фестывальныя касы — ці ёсць яшчэ білеты на якія-небудзь канцэрты «Славянскага базару»? Аказваецца, трапіць на выступленне «дзіця заганы» Барыса Маісеева ўжо не ўдасца, затое на сольны канцэрт Русланы, які адбудзецца ўвечары, засталася яшчэ невялікая колькасць білетаў. На спектаклі з удзелам расійскіх зорак квіткі таксама разабраныя, на джаз і класічны канцэрт яшчэ ёсць магчымасць трапіць — але вырашаць гэта трэба хутка, бо госці ўсё прыбываюць, а фестываль не збаўляе абаротаў.

Першай з краін-удзельніц фестывалю адзначылася ўласным Днём — з кіна- і тэатральнай праграмай, канцэртнымі выступленнямі — Расія. Сёлета ў творчым прадстаўленні ўдзельнічалі Надзея Бабкіна, Іосіф Кабзон, Алег Газманаў, Тамара Гвердцытэлі, Варвара і іншыя артысты, цікавыя розным пакаленням. З чаканых гасцей не прыехалі толькі Міхаіл Баярскі і Максім Дунаеўскі. Затое для большага ўражання і яркай тэлевізійнай карцінкі рэжысёры канцэрта прывезлі ў Віцебск самых сапраўдных паўночных аленяў. Праўда, палахлівыя жывёлы ўвесь час намагаліся збегчы са сцэны і памецілі пакрыццё, да захаплення з'едлівых крытыкаў...

«Дзякуй вялікі арганізатарам, што перанеслі фестываль на больш ранні тэрмін, раней дзень нараджэння мне заўжды даводзілася адзначаць на канцэртах», — расказаў журналістам Алег Газманаў. «Нічога, на гэты раз пачнём адзначаць загадзя», — суцешыла калегу Надзея Бабкіна. Але насамрэч Газманаў падарункаў напярэдадні не прымаў — наадварот, сам падарыў веласіпед дзіцячаму ансамблю, які суправаджаў выступленне спевака. Гледзячы, як ліха Газманаў пад'язджае ў прэс-цэнтр на веласіпедзе, мала хто паверыў бы, што 22 ліпеня Алегу Міхайлавічу споўніцца 57 гадоў.

Як заўжды, публіку і прэсу цікавіла якасць гуку на канцэртах — ці жывы гэта канцэрт, ці ўсё ж «фанерная» імітацыя. Надзея Бабкіна, да прыкладу, лічыць, што трапляць ва ўласную фанаграму — таксама мастацтва, і нічога страшнага ў гэтым няма. Алег Газманаў катэгарычна нязгодны: «Не ўмеюць маладыя артысты спяваць жыўцом — няхай вучацца, не ўмеюць тэлевізійныя рэжысёры запісваць жывы гук якасна — няхай вучацца! Усё прыходзіць з вопытам». Варвара пагадзілася — лепш, калі артыст працуе шчыра, не падманваючы ні гледачоў, ні сам сябе, але ўсё ж часам вялікія зборныя канцэрты вымагаюць «плюсавых» фанаграм. «Усе ўсё могуць, проста часам не ставіцца такая задача — працаваць жыўцом, — падсумавала Тамара Гвердцытэлі. — Спадзяюся, на «Славянскім базары» складзецца добрая традыцыя толькі і выключна жывых канцэртаў».

Дарэчы, Варвара, сама таго не жадаючы, стала жывой рэкламай беларускіх вытворцаў абутку: «Толькі прыехала — адразу на вакзале зламала абцас. Давялося бегчы ў абутковы магазін. Мяне нават без чаргі прапусцілі», — падзялілася артыстка.

Літоўскае прадстаўніцтва таксама стрымала сваё леташняе абяцанне — зрабіць на «Славянскім базары» вялікі канцэрт майстроў мастацтваў. Не без гонару літоўскі пасол у Беларусі Эдмінас Багдонас адзначыў і той факт, што на канцэрце адкрыцця фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» адзіная (!) беларускамоўная песня прагучала з вуснаў магутнагалосага тэнара Віргіліуса Нарэйкі...

Дарэчы, у Дзень Расіі і ў дзень Саюзнай дзяржавы віцебская публіка таксама атрымала гэты прыемны сюрпрыз. Расійскія артысты не толькі на словах выказваюць сваю прыхільнасць да «Славянскага базару», некаторыя пацвярджаюць гэта справай — выконваюць беларускія песні. І калі да маладога выканаўцы Аляксандра Ялаўскіх яшчэ былі б прэтэнзіі за няправільнае вымаўленне прыпеву «чарнявая, бялявая, і трэця — рыжа, кучаравая», то гурт «Сцэнакардыя» зрабіў сапраўдны падарунак — песню «А я лягу, прылягу» хлопцы аздобілі саксафонам і рэп-рэчытатывам. «Гэта песня нашага дзяцінства, мы вельмі яе любім. Нават у альбом спецыяльна ўключылі», — расказалі салісты Цімафей Хазанаў і Аляксей Мартынаў. Мяркуючы па апладысментах, з пастаўленай задачай хлопцы — а праз іх і фестываль — спраўляюцца. Каб толькі яшчэ нашы артысты часцей спявалі па-беларуску — глядзіш, і перастане родная мова быць экзотыкай, «фішкай» праграмы раз на год?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 3793. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

